

ВЯСЁЛЫЯ ГІСТОРЫІ З ЖЫЦЦЯ ЧЫТАЧОЎ **13**

«ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ» **5—12**



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

1 САКАВІКА 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 41 (28908)

**17-24 стар.** МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**ЛІЧБА ДНЯ**

**Больш за 50 %**

*білетаў ужо рэалізавана на цырымоніі адкрыцця і закрыцця II Еўрапейскіх гульняў. У цэлым жа з агульнай колькасці білетаў, якія паступілі ў продаж на 120 сесій, рэалізавана больш за 40 %. Продажы ідуць досыць бойка. Жаданне далучыцца да галоўнай мультыспартыўнай падзеі Еўропы 2019 года выказалі ўжо прадстаўнікі 28 краін. Самыя папулярныя сесіі, акрамя цырымоній адкрыцця і закрыцця, — спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы, пляжным футболе, мастацкай гімнастыцы і акрабатыцы, каратэ, на якія таксама ўжо прададзена 50 % і больш білетаў.*

# ЛЮБАМІР СУСТРАКАЕ ВЯСНУ



Любамір ФІЛІПОВІЧ надзвычай пазітыўны чалавек. Бадай, адзіны на ўвесь стольны Мінск вулічны музыкант, які спявае па-беларуску. Звонкі голас яго гармоніка і душэўныя песні можна пачуць у пераходах на розных станцыях метро, але асабліва музыканту падабаецца выступаць перад мінакамі на «Партызанскай» і «Плошчы Перамогі» — для гэтых пляцовак у яго складзены адпаведны ваенна-патрыятычны рэпертуар.

На жаль, гэтым здымкам нельга паказаць і сотую частку натхнення і душэўнага ўздыму нашага героя. Але ў невялікім відэа, якое змешчана на звяздоўскім сайце (раю ўсім паглядзець), можна адчуць, наколькі віртуозна валодае інструментам былы настаўнік фізікі, а цяпер пенсіянер з пасёлка Смілавічы Чэрвеньскага раёна, які сваімі песнямі «запальвае» пешаходаў. У сюжэце ён надзвычай цікава апавядае, як у дзевяць гадкоў навучыўся іграць, пра ўсе яго гармонік і чаму спявае на роднай мове. А таксама пра сваё незвычайнае імя — Любамір.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

**КОРАТКА**

- **У Беларусі распрацоўваецца новая мадэль вызначэння патрэбнасці ў сацпаслугах.**
- Беларускі сцяг падымуць на гары Манблан падчас эстафеты «Полымя міру» II Еўрапейскіх гульняў.
- **У рамках рэспубліканскай акцыі «Беларусь помніць» дадзены старт конкурсу «Франтавы альбом», прысвечанаму 75-й гадавіне вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.**



- Беларусбанк папярэджвае аб шкоднай рассылцы нібы ад імя банка. Пры паступленні падазроных лістоў ад імя банка неабходна звязацца з кантакт-цэнтрам па тэлефоне 147.

# Сёлета бюджэтнікам двойчы плануюць павысіць заробкі

**Міністр фінансаў Максім ЕРМАЛОВІЧ, звяртаючыся з дакладам да ўдзельнікаў сумеснага пасяджэння Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі і Савета Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, анансаваў павышэнне заробкаў бюджэтнікам.**

Ён нагадаў, што ў цэлым па бюджэтным сектары неабходна давесці памер сярэдняга заробку да 80 % ад сярэдняй заработнай платы па эканоміцы, але задача, якая пастаўлена кіраўніком дзяржавы, ні летась, ні ў студзені бягучага года не была выканана.

— Гэтую задачу мы з вамі абавязаны ў 2019 годзе вырашыць, — падкрэсліў ён, звяртаючыся да народных абраннікаў. — Гэта азначае, што мы павінны знайсці рэсурсы дзеля чарговага павышэння заработнай платы.

Па словах міністра фінансаў, сёлета плануецца два этапы павышэння: у маі (у межах тых сродкаў, якія прадугледжаны ў бюджэце) і ў верасні (дзеля гэтага неабходна дадаткова каля 200 мільёнаў рублёў). Дасягненне такіх параметраў прадугледжана мэтавым сцэнарыем развіцця эканомікі на 2019 год.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

Разумныя грошы

# СЯМЕЙНАЯ ПАДУШКА БЯСПЕКІ

**Дзе ўзяць фінансы на форс-мажор**

**У жыцці бываюць усякія непрадбачаныя сітуацыі. Бо ніхто не застрахаваны, напрыклад, ад паломкі халадзільніка і неабходнасці яго рамонту або тэрміновай куплі новага (наўзамен старога). Бывае, што цяжка «ўцячы» ад хвароб і непрацаздольнасці, а як вынік — праблемы з працай ці іншыя непрыемнасці. Добра, што ўсе гэтыя цяжкасці да нас яшчэ не прыйшлі, але...**



У вас абавязкова павінен быць рэзервовы фонд, які з'яўляецца свайго роду страхавым полісам, і які можна выкарыстаць у выпадку форс-мажору. **Кандыдат эканамічных навук Вольга КУПЧЫНАВА** дапамагала нам расклasці сямейны бюджэт па палічках і растлумачыла, як сфарміраваць фінансавую падушку бяспекі.

**ПЛАНУЙЦЕ СВАЕ РАСХОДЫ**

Каб сямейны бюджэт быў заўсёды з плюсам, неабходна адначасова весці падлік усіх артыкулаў яго выдаткаў. Гэта могуць быць паўсядзённыя выдаткі, штомесячныя і сезонныя. Да апошніх адносяцца, напрыклад, купля зімовага (летняга) адзення, набыццё падручнікаў у школу. Сюды ўваходзяць расходы на падзеі жыццёвага (вучоба, шлюб дзяцей, юбілеі сваякоў), а таксама на непрадбачаныя сітуацыі (напрыклад, рамонт аўтамабіля пасля аварыі) і іншыя.

Увогуле, выдаткі могуць класіфікавацца і па мэтавых напрамках, але галоўнае ў тым, каб кожны член сям'і свядома адрозніваў расходы на тое, што «хачу» і што «трэба», і ўмеў правільна вызначаць прыярытэты.

**СТАР. 4**

ISSN 1990 - 763X

# ДОБРАЯ ПРЫВЫЧКА ДА БЯСПЕКІ

## Кіраўнік дзяржавы прыняў з дакладам міністра ўнутраных спраў Ігара Шуневіча

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што сустрэча праходзіць перад вялікай нарадай з сілавым блокам краіны, дзе будзе сур'ёзна прааналізавана работа праваахоўных органаў у цэлым, а міліцыя будзе ў цэнтры ўвагі, «бо гэта асноўнае і самае буйное падраздзяленне і яго датычацца многія пытанні ўнутранай і нават знешняй бяспекі».**

«Асаблівасць будзе заключацца ў тым, што мне спатрэбіцца не столькі справаздача любога сілавога ведамства, колькі ўказанне на тыя праблемы, якія сёння існуюць, у дадзеным выпадку — у сферы дзейнасці нашай міліцыі», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка.

Таму ён папрасіў міністра расказаць пра работу МУС коратка і галоўным чынам пра тыя сферы, дзе цяжка нешта прыпісаць або схаваць, перш за ўсё — пра колькасць і раскрывальнасць цяжкіх злачынстваў, а таксама пра расследаванне тых крымінальных спраў, якія знаходзяцца на кантролі Прэзідэнта. Ён таксама папрасіў суразмоўніка спыніцца на тых момантах, якія найбольш насцярожваюць па лініі міліцыі ў нашым грамадстве. Яшчэ адна тэма сустрэчы — кадравае забеспячэнне органаў унутраных спраў.

Аляксандр Лукашэнка прапанаваў абмеркаваць і выступленні хакейнага клуба «Дынама-Мінск», у якім кіраўнік МУС з'яўляецца старшынёй наглядальнага савета.

Ігар Шуневіч далажыў Прэзідэнту, што па выніках работы МУС за 2018 год аператыўная абстаноўка і ў цэлым стан бяспекі ў краіне заставаліся на ранейшым узроўні. «Нам удалося захаваць гэты ўзровень, выканаць абяцанні і задаволіць патрабаванні нашага народа ў адносінах да бяспекі, да якой ён ужо прызвычаіўся», — сказаў міністр.

У каментарыі журналістам вынікаў сустрэчы з Прэзідэнтам міністр унутраных спраў падкрэсліў, што даклад пра асноўныя параметры, якія характарызуюць аператыўную абстаноўку ў краіне за мінулы год, з'яўляецца традыцыйным. «Дарэчы, трэнд, які намеціўся некалькі гадоў таму, — на зніжэнне асабліва цяжкіх і цяжкіх злачынстваў, быў вытрыманы і ў 2018 годзе, — сказаў ён. — У цэлым аператыўная абстаноўка заставалася пад нашым кантролем».

Міністр паведаміў, што размова ў асноўным ішла пра задачы, якія органамі ўнутраных спраў будуць вырашацца сёлета, нявырашаныя праблемы і пра некаторыя хібы, якія дапусціла міліцыя.

Ён запэўніў, што органы ўнутраных спраў на статыстыку звяртаюць увагу ў апошнюю чаргу. «Арыентуемся на найбольш важныя паказчыкі ў нашай рабоце: грамадская думка пра нашу дзейнасць, якая сёння вымяраецца староннімі арганізацыямі, і раскрывальнасць злачынстваў, — растлумачыў Ігар Шуневіч. — Для нас вялікае значэнне мае колькасць загінулых у выніку дарожна-транспартных здарэнняў, злачынных дзеянняў. Калі мы бачым, што з кожным годам іх становіцца ўсё менш, значыць, мы робім усё правільна».

Але традыцыйна ёсць моманты, якія патрабуюць дашліфоўкі, падкрэсліў кіраўнік МУС. У гэтай сувязі ён назваў аператыўнасць рэагавання, прафесіяналізм супрацоўнікаў органаў унутраных спраў і пытанні забяспечанасці. «У тым ліку сёння размова ішла пра глабальны маніторынг грамадскай бяспекі з дапамогай відэаназірання, — паведаміў Ігар Шуневіч. — Лічу, што раскрывальнасць непасрэдна залежыць ад колькасці і якасці вырашэння пытання па ўсталяванні відэакамер. Ва ўсякім разе, гэта асноўны метад раскрыцця вулічных хуліганстваў».

На вялікую нараду сілавых ведамстваў, якая хутка адбудзецца, МУС падрыхтавала некалькі прапаноў, у тым ліку адну з іх Ігар Шуневіч абмеркаваў з кіраўніком дзяржавы. Размова ідзе пра больш жорсткую адказнасць тых удзельнікаў дарожнага руху, якія знарок і шматразова парушаюць правілы і ствараюць небяспеку на дарозе. «Мы прапануем увесці бальную сістэму рэагавання на парушэнні такіх грамадзян з перспектывай часовага пазбаўлення іх магчымасці кіраваць транспартнымі сродкамі. Я бы не сказаў, што гэта нейкае ноу-хау, ва ўсім свеце такая практыка даўно рэалізуецца і мае станоўчы вопыт», — заявіў ён.

Узровень дарожнай бяспекі ў Беларусі супастаўны з еўрапейскім, сказаў міністр. Гэта не нагода для заспакаення, бо гібель нават аднаго чалавека, асабліва дзіцяці (22 непаўналетнія — на адно дзіця больш загінула летась на дарогах Беларусі, чым у папярэдні год) — невымяральная страта.

Што датычыцца аптымізацыі, то яна магчымая, і маецца на ўвазе не толькі скарачэнне колькасці супрацоўнікаў. «Аптымізацыя — гэта і гарманічнае спалучэнне адпаведнасці пасадам канкрэтных супрацоўнікаў, і пытанні кадравай палітыкі, і прысваенне чарговых званняў, і замяшчэнне работы штатных супрацоўнікаў тэхнічнымі магчымасцямі. Шматвектарная работа, якая працягваецца ў МУС пастаянна. Механічна нешта ліквідаваць — мы сабе такой задачы не ставім», — растлумачыў Ігар Шуневіч.

Адказваючы на пытанне карэспандэнта «Звязды» аб адметнасцях злачыннасці нашага часу, міністр адзначыў: «Наша стагоддзе — час высокатэхналагічных і досыць бесчалавечных злачынстваў, хоць ніякае злачынства нельга назваць чалавечным. Але сёння злачыннасць вызначаецца поўным ігнараваннем нормаў і правілаў чалавечай супольнасці, яна абсалютна прагматычная і нялюдская і, нягледзячы ні на што, дамагаецца сваіх вынікаў. Гэта датычыцца і новых злачынстваў — камп'ютарных, — і злачынстваў у сферы маралі. Ды і ў цэлым — усяго спектра».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

### У ТЭМУ

У мінулым годзе агульная колькасць зарэгістраваных злачынстваў знізілася на 2,9 % (да 83,8 тысячы), у тым ліку цяжкіх і асабліва цяжкіх. Менш здзейснена забойстваў з замахамі, згвалтаванняў, разбояў, грабяжоў, крадзяжоў, у тым ліку з жылых дамоў, згонаў. Удзельная вага злачынстваў па лініі крымінальнага вышуку, па якіх устаноўлены падазраваны, склала 65,7 %, у тым ліку асабліва цяжкіх і цяжкіх — 94,9 %.

Перарвана 29 каналаў паставак на тэрыторыю Беларусі транзіту наркатычных рэчываў, знойдзена сем нелегальных лабараторый па вырабе псіхатропных рэчываў і 42 спецыяльна абсталяваныя памяшканні для вырошчвання раслін, якія змяшчаюць наркатычныя рэчывы. З незаконнага абароту канфіскавана 844,8 кілаграма наркатычных рэчываў і 36,7 кілаграма псіхатропаў.

Захавалася тэндэнцыя зніжэння колькасці злачынстваў, здзейсненых непаўналетнімі, у стане алкагольнага ап'янення, грамадзянамі, якія маюць судзімасць. Менш здзейснена злачынстваў у гарадскіх месцах і ў сельскай мясцовасці. Разам з тым у сельскай мясцовасці ўзрасла колькасць забойстваў з замахам, згвалтаванняў, катаванняў і хуліганстваў.

Летась знізілася колькасць дарожна-транспартных здарэнняў, а таксама загінулых і параненых у іх грамадзян, але адбылося больш аўтааварый з удзелам падлеткаў, а таксама ўзрасла колькасць загінулых і параненых у іх дзяцей.

Зарэгістраваны рост асабліва цяжкіх і цяжкіх злачынстваў у сферы сямейна-бытавых адносін за кошт павелічэння колькасці здзейсненых у адносінах да членаў сям'і і блізкіх сваякоў наўмысных прычыненняў цяжкага цялеснага пашкоджання і гвалтоўных дзеянняў сексуальнага характару.


**РУП «Институт недвижимости и оценки» (организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Доломит» (продавец)**

**Лот № 1.** Силосный склад цеха № 2, инв. № 200/С-96175, площадь – 1588,2 кв. м, г. п. – 1967. Адрес: г. Витебск, ул. Центральная, 25/31. **Начальная цена, бел. руб.** – 71 563,20 с НДС. **Задаток, бел. руб**. – 10 000,00. **Шаг аукциона** – 5 %.

**Земельный участок:** 240155400001000020, долевое пользование. Переход права на долю земельного участка осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Размер штрафа в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609 составляет 10 000,00 белорусских рублей.

**Аукцион состоится 27.03.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by.

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Доломит», проводимом 27.03.2019 г. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 7. Окончание приема заявлений: 25.03.2019 в 11.00. Первое, полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 21.11.2018

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

**РУП «Институт недвижимости и оценки» (организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Доломит» (продавец)**

**Лот № 1.** Гараж, 109,4 кв. м, инв. № 200/С-58561. Адрес: г. Витебск, ул. Центральная, д. 27А. **Начальная цена, бел. руб.** – 7 680,00 с НДС. **Задаток, бел. руб**. – 1 000,00. **Шаг аукциона** – 5 %. **Земельный участок** 221200000001000174, 0,0183 га. **Обременение:** договор аренды от 01.11.2018 № 273 (109,4 кв. м), действует по 31.10.2021.

Размер штрафа в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609 составляет 1 000,00 белорусских рублей.

**Аукцион состоится 15.03.2019 в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by.

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Доломит», проводимом 15.03.2019 г. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 7. Окончание приема заявлений: 13.03.2019 в 11.00. Первое, полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 11.12.2018

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**


**Отчет Местного благотворительного фонда «Помощь – это просто!» (далее – Фонд) об использовании своего имущества в 2018 году**

Утвержден Протоколом Правления Фонда № 1 от 25.02.2019 г.

Утвержден Протоколом заседания Попечительского совета Фонда № 1 от 25.02.2019 г.

| н/п | Сведения, обязательные для включения в состав отчета | Информация Фонда |
|---|---|---|
| 1 | Информация о количестве учредителей Фонда | 1. Манина Елена Викторовна<br>2. Личко Наталья Игоревна<br>3. Куприенко Елена Викторовна |
| 2 | Информация о стоимости имущества Фонда | А) стоимость имущества, переданного учредителем Фонда, – 1 666,93 рубля;<br>Б) поступления от проводимых в 2018 году мероприятий – 1 402,61 рубля;<br>В) иные не запрещенные законодательством Республики Беларусь поступления – 0 рубля;<br>Г) Доходы от предпринимательской деятельности у Фонда в 2018 году отсутствовали |
| 3 | Общая сумма расходов, понесенных Фондом на достижение общественно полезных целей, указанных в его уставе | 1 616,23 рубля |
| 4 | Информация об унитарных предприятиях, хозяйственных обществах, созданных Фондом для осуществления предпринимательской деятельности, в том числе об участии Фонда в таких юридических лицах | В 2018 году Фонд не создавал унитарных предприятий или хозяйственных обществ, не становился участником в таких юридических лицах |

УНП 691150172


Открытое акционерное общество «Искра-М»
Адрес: 220075 г. Минск, ул. Инженерная, 1а.
Решение принято наблюдательным советом 27.02.2019 г.
Реестр акционеров будет сформирован по состоянию на 20.03.2019 г.
УНП 100018385


# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Трамп і Кім Чэн Ын не дамовіліся



Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп і лідар Паўночнай Карэі Кім Чэн Ын не змаглі прыйсці да пагаднення на саміце ў в'етнамскім Ханоі. Пра гэта паведаміла інфармагенцтва Reuters са спасылкай на прадстаўніка Белага дома. «Пагадненне не было дасягнута, але бакі збіраюцца сустрэцца зноў у будучыні», — сказала прэс-сакратар амерыканскай адміністрацыі Сара Сандэрс. Прэзідэнт ЗША расказаў аб ходзе сустрэчы з Кім Чэн Ынам падчас сумеснай прэс-канферэнцыі з дзяржсакратаром ЗША Майкам Пампеа, трансляцыю якой праводзіла Bloomberg. Трамп перакананы, што нягледзячы на адсутнасць дамовы, бакі дамагліся прагрэсу і захавалі цёплыя адносіны. Кім Чэн Ын, паводле яго слоў, паабяцаў не праводзіць новыя выпрабаванні ядзернай зброі. Трамп расказаў, што лідар КНДР запатрабаваў зняцця ўсіх санкцый, на што ЗША не маглі пайсці з-за таго, што той не пайшоў на саступкі па пытанні ядзернага раззбраення на дастатковым узроўні. Як піша агенцтва Reuters, раней абодва палітыкі выказалі аптымізм з нагоды магчымага дасягнення прагрэсу ў гэтым пытанні. Пасля навіны пра заўчаснае заканчэнне сустрэчы на паўднёвакарэйскіх біржах абваліліся каціроўкі. Як вядома, першы саміт ЗША — КНДР прайшоў у Сінгапуры 12 чэрвеня 2018 года. Па яго выніках бакі прынялі сумесную заяву, у якой гаварылася пра гатоўнасць КНДР да поўнай дэнуклеарызацыі. У адказ ЗША абавязаліся даць Пхеньяну гарантыі бяспекі.

### Названы галоўныя рызыкі для сусветнай эканомікі

Эксперты брытанскага часопіса The Economist склалі даклад, у якім указалі асноўныя пагрозы сусветнай эканоміцы ў 2019 годзе. Пры спрыяльным сцэнарыі аналітыкі прагназуюць, што тэмпы росту сёлета запаволяцца да 2,8 працэнта і да 2,6 працэнта — у 2020-м. Летась прырост склаў 2,9 працэнта. Аднак у выпадку рэалізацыі некалькіх рызыкоўных сцэнарыяў тэмпы росту эканомікі могуць аказацца значна ніжэй за названыя значэнні. Віной таму — геапалітычная напружанасць, а таксама сур'ёзныя ўразлівасці ў найбуйнейшых эканоміках і на рынках, якія развіваюцца. Так, найбольш сур'ёзнымі пагрозамі эксперты The Economist палічылі рызыку перарастання гандлёвага канфлікту паміж ЗША і Кітаем у поўнамаштабную вайну, а таксама магчымую рэцэсію эканомікі ЗША з-за вялікіх даўгоў амерыканскіх кампаній. Акрамя таго, эканамісты расказалі пра такія рызыкі, як шырокамаштабны крызіс на рынках, якія развіваюцца, пачатак зацяжнога крызісу ў Кітаі, рэзкі скачок цэн на нафту, пачатак ваенных дзеянняў з-за спрэчак аб прыналежнасці астравоў у Паўднёва-Кітайскім моры і пачатак ваенных дзеянняў на Карэйскім паўвостраве. Таксама сярод пагроз сусветнай эканоміцы — пачатак банкаўскага крызісу ў Італіі з-за палітычнай і фінансавай нестабільнасці ў краіне, выхад Вялікабрытаніі са складу Еўрасаюза без здзелкі, а таксама шкода ў выніку кібератакі.

### Прычынай катастрофы на чыгуначным вакзале ў Каіры стала сварка машыністаў

Сварка машыністаў двух цеплавозаў стала прычынай крушэння лакаматыва на вакзале Рамсэс у Каіры — найбуйнейшай чыгуначнай станцыі Егіпта, — у выніку чаго адбыўся буйны пажар і загінула звыш 20 чалавек і пацярпела каля 50. Пра гэта расказаў генеральны пракурор Егіпта Набіль Садэк, паведамляе газета Al-Ahram. Прадстаўнік нагляднага ведамства растлумачыў, што машыніст лакаматыва, які ўрэзаўся ў адбойнік, пакінуў кабіну цеплавоза для таго, каб высветліць адносіны з машыністам цягніка, які заступіў яму дарогу. Аднак, калі чыгуначнік пакінуў сваю кабіну, кіроўца іншага цеплавоза даў задні ход, каб пазбегнуць разбору. У гэты момант лакаматыў, які аказаўся без машыніста, пачаў набіраць хуткасць і ў выніку ўрэзаўся ў адбойнік і прыбудову асноўнага будынка цэнтральнага вакзала Каіра, адзначае выданне. Па інфармацыі Sky News Arabia, у цягніка выбухнуў паліўны бак, з-за чаго адбыўся моцны пажар.

Ва ўрадзе

# БІЗНЕС ГАРАДЫ БЯРЭ

**«Заробак ніжэйшы за 600 рублёў — гэта няправільна», — з такой думкі першы віцэ-прэм'ер Аляксандр ТУРЧЫН пачаў чарговае пасяджэнне Савета па развіцці прадпрымальніцтва, якое адбылося ў Савеце Міністраў. На гэты раз тэмай сустрэчы прадстаўнікоў улады і бізнесу стала «Развіццё прадпрымальніцтва ў рэгіёнах: стан, праблемы, шляхі іх вырашэння».**

— Для мяне гэта два кірункі: як актывізаваць бізнес, які знаходзіцца на тэрыторыі гэтага раёна, каб ён ператвараўся ў больш паспяховую кампанію, і як прыцягнуць у гэтыя рэгіёны бізнес з буйных гарадоў, — абазначыў праблемныя пытанні першы намеснік прэм'ер-міністра.

## СТАН

— Калі казаць аб тэрытарыяльнай структуры развіцця малога і сярэдняга бізнесу, яна на працягу двух дзесяцігоддзяў па вялікім рахунку не змянілася. Нягледзячы на тое, што ў нас была рэалізавана дзяржаўная праграма па развіцці малых і сярэдніх прадпрыемстваў, у нас дзейнічае Дэкрэт № 6 аб развіцці малых і сярэдніх прадпрыемстваў у малых гарадах, сельскай мясцовасці, сельскіх пасяленнях і гэтак далей. Або дадзеныя меры нядзейсныя, або дзейсныя ў недастатковай ступені, — лічыць **Жанна ТАРАСЕВІЧ, дырэктар Бізнес-саюза прадпрымальнікаў і наймальнікаў імя прафесара М. С. Куняўскага.**

У структуры малога і сярэдняга прадпрымальніцтва 87 % займаюць мікраарганізацыі, на якіх працуюць 3-4 работнікі. Апошнія гады назіраецца павелічэнне працэнта самазанятых грамадзян. Што датычыцца сярэдняга бізнесу, то яго колькасць з гадамі зніжаецца.

Каля 40 % прадпрымальнікаў сёння занятыя ў гандлі, 13 % — у апрацоўчай прамысловасці, 10 % — у транспарце, на ўсе астатнія галіны прыходзіцца да 5 %. Менш за 1% развіваюць праекты ў сацыяльнай сферы — у адукацыі, ахове здароўя, культуры. Асноўная маса суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва засяроджана ў Мінску і абласных цэнтрах.

Аляксандр Турчын адзначыў, што ў хуткім часе ўрад накіруе ў Адміністрацыю Прэзідэнта ініцыятывы аб матэрыяльным стымуляванні дзяржаўных служачых, якія імкнуцца развіваць бізнес у сваім рэгіёне.



## ПРАБЛЕМЫ

Сярод праблемных пытанняў, паводле экспертаў, — плошчы для стварэння бізнесу ў рэгіёнах. Часта іх рамонт, арганізацыя інфраструктуры (святло, ацяпленне) каштуюць і грошай, і часу. Тут могуць дапамагчы тэхналагічныя паркі з усёй неабходнай базай. Бізнесмен можа арандаваць памяшканне для працы і плаціць арэнду.

Яшчэ бар'ер — прыцягненне свабодных інвестыцый. Адзначылі як праблему і недастатковую кваліфікацыю рабочай сілы.

— Калі гаворым пра працу ў рэгіёнах, то колькасць людзей абмежаваная і прафесіяналізм выклікае пытанні. Усе астатнія ўмовы такія, як і ў гарадах. Ёсць значныя льготы па падатках на прыбытак. Але сёння ў многіх бізнесах пытанне не ў тым, каб са 100 рублёў 18 ці 10 аддаць дзяржаве, а ўвогуле ў наяўнасці прыбытку. Таму гэта льгота добрая, калі ёсць прыбытак, — заўважыў **Валянцін БАЙКО, старшыня агульнага сходу ўдзельнікаў сумеснага таварыства з абмежаванай адказнасцю «Контэ Спа».** — Буйныя вытворцы і прадпрыемствы не могуць існаваць толькі ў дзяржаве, дзе дзесяць мільёнаў жыхароў. Мы вымушаны глядзець на рынкі Расіі, Казахстана, Украіны. Таму для любога прадпрымальніка пытанне: ставіць фабрыку ў малым горадзе Беларусі ці пабудаваць яе на Узбекістане? Мы, на жаль, разглядаем і такія пытанні, таму што там газ, электрычнасць, рабочая сіла таннейшыя.

## ШЛЯХІ РАШЭННЯ

Калі мы хочам быць канкурэнтаздольнымі, мы павінны развіваць высокатэхналагічны малы і сярэдні аграбізнес. З такой ідэяй выступіла **прафесар Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта Людміла СОВІК.**

Адной з самых паспяховых праграм падтрымкі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ў краіне з'яўляецца стварэнне фондаў. Пра гэты метад расказаў **старшыня праўлення Банка развіцця Андрэй ЖЫШКЕВІЧ.** У 2018 годзе ўстанова каля 200 мільёнаў рублёў размясціла ў фондах праз сетку банкаў-партнёраў і лізінгавых кампаній для таго, каб гэтыя банкі праз сваю структуру выдавалі крэдыты прадпрымальнікам.

На думку Андрэя Жышкевіча, складана на ўзроўні абласцей сфарміраваць працэдуру адбору праектаў, выканаць функцыю крэдытнай экспертызы, таму трэба было б цэнтралізаваць гэтыя задачы і перадаць пэўнай установе.

— Гэта ідзе ўжо доўгія гады абмяркоўваецца. Прадпрымальнікі не маюць нерухомасці, якая задавольвае банкі, складана афармляць заклады нетаварнага тыпу. Таму рашэнне праблемы недастатковасці забеспячэння праз даванне гарантый таксама гучала. Зараз фонд падтрымкі прадпрымальніцтва падрыхтаваў запуск гарантыйнага фонду, — паведаміў Андрэй Жышкевіч.

Гэта значна палепшыць доступ бізнесу да крэдытных ліній. Па словах генеральнага **дырэктара Беларускага фонду фінансавай падтрымкі прадпрымальнікаў Паўла ГОРБАЧА,** гарантыйны фонд запрацуе ў найбліжэйшыя месяцы.

— Сэнс дзейнасці гарантыйнага фонду — гэта выдача паручыцельстваў па праектах, калі суб'ектам малога прадпрымальніцтва недастаткова забеспячэння пры звароце па крэдыт у банк, — расказаў пра ідэю Павел Горбач.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# МАГЧЫМАСЦЬ ВЫКАЗАЦЦА

**Чарговыя прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца 2 сакавіка ў аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме. Тэлефонныя лініі ў суботу з 9.00 да 12.00 правядуць:**

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Андрэй Анатолевіч КЛЕЦ. Тэл. 8 016 221 31 21;

старшыня ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Мікалай Мікалаевіч ШАРСНЁЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

кіраўнік спраў ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Алена Уладзіміраўна КЛІЧКОЎСКАЯ. Тэл. 8 023 233 12 37;

старшыня ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Васілевіч КРАЎЦОЎ. Тэл. 8 015 273 56 44;

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Руслан Віктаравіч ПАРХАМОВІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;

намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Мікалай Міхайлавіч РАГАШЧУК. Тэл. 8 017 500 41 60;

кіраўнік спраў МІНСКАГА гарвыканкама Ганна Мар'янаўна МАЦЕЛЬСКАЯ. Тэл. 8 017 222 44 44.

# ПЛАНКУ НЕ ЗНІЖАЕМ

**Адбылося першае пасяджэнне арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні ў 2021 годзе ў Мінску чэмпіянату свету па хакеі з шайбай.**

**Прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей РУМАС** адзначыў, што гэты турнір павінен прайсці на высокім узроўні. «У нас ужо ёсць вопыт правядзення сусветнага першынства. Чэмпіянат свету па хакеі ў 2014 годзе быў прызнаны Міжнароднай федэрацыяй хакея адным з найлепшых у гісторыі і пабіў рэкорды наведвальнасці. У 2021 годзе мы праводзім чэмпіянат па хакеі з шайбай сумесна з Латвійскай Рэспублікай. Узровень гатоўнасці краіны да яго правядзення дастаткова высокі: маюцца лядовыя арэны, у сталіцы пабудавана дастатковая колькасць гасцініц і аб'ектаў грамадскага харчавання. Тым не менш мы павінны зрабіць усё неабходнае, каб гэты чэмпіянат стаў найлепшым і больш паспяховым. Планку не зніжаем», — падкрэсліў Сяргей Румас. Яго словы прыводзіць карэспандэнт БелТА.

**Старшыня Федэрацыі хакея Беларусі — намеснік старшыні аргкамітэта Генадзь САВІЛАЎ** адзначыў, што падрыхтоўка да чэмпіянату свету пачалася два гады таму. Ужо сфарміравана дырэкцыя чэмпіянату, аргкамітэт, падпісаны трохбаковы дагавор з Міжнароднай федэрацыяй хакея, двухбаковы дагавор з Латвіяй, на выхадзе бізнес-план па падрыхтоўцы і правядзенні турніру. «Шмат што зроблена, і самае галоўнае, ёсць разуменне, што мы будзем рабіць далей», — сказаў ён.

Нагадаем, чэмпіянат свету па хакеі з шайбай пройдзе ў Мінску і Рызе з 7 да 23 мая 2021 года. У ім возьмуць удзел 16 каманд. У Мінску адбудуцца гульні адной групы — 34 матчы, у тым ліку два чвэрцьфінальныя і два паўфінальныя матчы, гульня за трэцяе месца і фінал.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

Надвор'е

# ЯШЧЭ БУДЗЕ СНЕГ У САКАВІКУ

## А на асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца і ўначы да 13 марозу

**Вось ужо папраўдзе цяперашні апошні месяц зімы выдаўся ў гэтым годзе экстра цёплым. У лютым сярэдняя тэмпература паветра аказалася на 4—5 градусаў вышэйшай за кліматычную норму. Аднак, як паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды, ужо ў першыя дні вясны чакаецца кароткачасовае пахаладанне.**

Надвор'е будзе толькі пагаршацца. Так, у суботу будзе пераважна без ападкаў, толькі ўначы па ўсходзе краіны месцамі пройдзе невялікі снег. На асобных участках дарог прагназуецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы паніжаецца ад мінус 4 да мінус 11 градусаў. Днём таксама будзе холадна, чакаецца ад мінус 5 градусаў да 2 цяпла.

Пераменнае надвор'е чакае нас і ў нядзелю. Гэтай ночу наша тэрыторыя будзе пад уплывам вобласці павышанага атмасфернага ціску, так што абыдземся без істотных ападкаў. Удзень тэрыторыя краіны апынецца пад уплывам атмасферных франтоў, за якімі пачне паступаць цёплая паветраная маса атлантычнага паходжання. На большай частцы тэрыторыі чакаюцца ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Месцамі туман, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы ў асноўным складзе ад мінус 4 да мінус 11 градусаў, па паўднёвым усходзе месцамі пры праяснення яна панізіцца да 13 марозу, толькі ў заходніх раёнах не апусціцца ніжэй за мінус 3 градусы. Тэмпература ўдзень складзе ад 0 да 6 цяпла, па паўднёвым захадзе паветра прагрэецца да плюс 8 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак умовы надвор'я ў краіне будуць вызначаць атмасферныя франты, якія будуць рухацца да нас з Заходняй Еўропы. У многіх раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Уначы месцамі слабыя туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 градусаў да 4 цяпла, удзень — ад плюс 2 градусаў да плюс 7, па паўднёвым захадзе да 11 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**


**ОАО «Опытный завод металлоконструкций» проводит очередное собрание акционеров по адресу: г. Минск, пр-т Пушкина, 68, зал заседаний, дата проведения собрания: 29 марта 2019 года, начало – 15.30**

Повестка дня:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности общества за 2018 год и основных направлениях деятельности на 2019 год.
2. Отчет наблюдательного совета о проделанной работе за 2018 год.
3. Отчет о результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности общества ревизионной комиссией за 2018 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса и отчета о прибылях и убытках общества за 2018 год.
5. Утверждение распределения прибыли, оставшейся в распоряжении предприятия за 2018 год. О выплате дивидендов за 2018 год.
6. Утверждение плана распределения прибыли, остающейся в распоряжении общества на 2019 год. Периодичность выплаты дивидендов за 2019 год.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии. Утверждение вознаграждения членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
8. Рассмотрение выполнения управляющей организацией ООО «КверкСтройИнвест» договора № 2 от 14 января 2018 года «О передаче полномочий единоличного исполнительного органа хозяйственного общества управляющей организации».

Для регистрации при себе иметь следующие документы: паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Справки по телефону 204-30-72.

УНП 100135691


**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокія спачуванні Андрэю Аляксеевічу Раўкову, міністру абароны Рэспублікі Беларусь, у сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

## Сталічны ЧАС

• Новую экспазіцыйную аранжарэю з гандлёва-выставачным павільёнам плануецца пабудаваць у Цэнтральным батанічным садзе НАН Беларусі. Рэканструкцыя Батанічнага сада ўваходзіць у дзяржаўную праграму «Навукаёмістыя тэхналогіі і тэхніка». Комплекс будзе ўключаць экспазіцыю трапічнай і субтрапічнай флоры з неабходным мікракліматам, ландшафтам і вялікай колькасцю адкрытых водных паверхняў, вадаспадаў, адміністрацыйныя, гаспадарчыя і дапаможныя памяшканні, паведамляе БелТА. Акрамя таго, тут плануецца адкрыць кафэ на 45—50 пасадачных месцаў, культурна-асветніцкі блок з інфармацыйнай зонай і вучэбна-адукацыйным цэнтрам. Мяркуецца таксама будаўніцтва падземнага паркінга на 49 машына-месцаў і асобнай наземнай паркоўкі на 10 машына-месцаў для стаянкі экскурсійных аўтобусаў. Рэалізаваць праект плануецца да 2020 года.

• Да канца сакавіка ў сталіцы мяркуюць устанавіць восем светлавых фігур з эмблемай II Еўрапейскіх гульняў. Пра гэта карэспандэнту агенцтва «Мінск-Навіны» паведаміў **дырэктар УП «Мінгарсвятло» Славамір ГРЫНЕВІЧ.** «Фігуры будуць устаноўлены на ўездах у горад, каля будынка чыгуначнага вакзала», — удакладніў спецыяліст. Як вядома, восенню мінулага года прадпрыемства «Мінгарсвятло» ўжо ўсталявала шар з лагатыпам II Еўрапейскіх гульняў каля сталічнага Палаца спорту.

# СЯМЕЙНАЯ ПАДУШКА БЯСПЕКІ



***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Вольга Купчынава ўпэўнена, што ў асабістым бюджэце выдаткі заўсёды павінны адпавядаць даходам. Калі першыя большыя, трэба знайсці артыкулы эканоміі або падумаць аб дадатковых заробках. Вашы зберажэнні павінны быць абаронены ад інфляцыі і прыносіць прыбытак. Таму грошы трэба трымаць не дома, а пакласці на банкаўскі дэпазіт альбо набыць на іх аблігацыі ці іншыя высокаліквідныя каштоўныя паперы.

Каб годна жыць і ў старасці, варта паспрабаваць забяспечыць да выхаду на пенсію дадатковыя крыніцы даходаў. Гэта могуць быць фінансавыя зберажэнні, якія прыносяць працэнт, альбо іншыя актывы, здольныя даваць прыбытак.

## ПАЗЫЧАЦЬ ЛЕПШ З «ХАЛОДНАЙ» ГАЛАВОЙ

Перш чым браць крэдыт, трэба зрабіць цвярозую ацэнку рэальнай патрэбы ў ім. Наступным пунктам стане падрабязны аналіз сваіх магчымасцяў па пагашэнні пазыкі і працэнтаў, а таксама ўсіх умоў крэдытнага дагавора. Не лішнім будзе і спрагназаваць сітуацыю, калі прыйдзецца несці адказнасць перад банкам і паручыцелем у выпадку непагашэння доўгу.

Трэба выразна ўяўляць, што, карыстаючыся крэдытам, вы аддаяце за пакупку больш. Чым даўжэй выплачваеце крэдыт, тым большыя выдаткі па ім. Акрамя таго, даступнасць куплі за кошт крэдыту можа справакаваць неразумныя марнаванні. І апошняе: набываючы ў крэдыт, вы звязваеце сябе даўгавымі абавязацельствамі і абмяжоўваеце ў будучыні свае фінансавыя магчымасці.

## ВЫРАТАВАЛЬНАЯ «СХОВАНКА» ДЛЯ БЮДЖЭТУ

Ідэальным варыянтам з'яўляецца наяўнасць у сям'і пэўнай сумы на запас, якая дазволіць без атрымання дадатковых даходаў пражыць некаторы час, аплачваючы пры гэтым камунальныя паслугі і мабільную сувязь і набываючы прадукты харчавання. У залежнасці ад вашых жыццёвых абставін рэкамендаваны памер фінансавага рэзерву будзе такі.

Варыянт «стабільны». Калі ваша праца носіць стабільны характар і ў вас ёсць блізкія сваякі і сябры, у якіх можна пазычыць грошай на некаторы час, то падушка бяспекі павінна быць у выглядзе сумы выдаткаў на тры месяцы. Наступны варыянт — «са сваякамі не пашанцавала». Калі праца і даход не зусім стабільныя і ў блізкіх няма асаблівых магчымасцяў вам дапамагчы, ваша «схованка» павінна быць цяжэйшай — гэта грошы на шэсць месяцаў пражывання. Трэці варыянт называецца «вымушаны сірата». Гэта той выпадак, калі небяспека страты работы вялікая, сваякоў ужо няма і сяброў страцілі. У дадзенай сітуацыі фінансавы рэзерв сям'і — на бягучыя выдаткі на 9—12 месяцаў.

## САБЕ АДКЛАДАЙ ДЗЕСЯЦІНУ

Умець «знаходзіць» грошы — якасць надзвычай карысная і патрэбная. Гэта разумны крок да бяспечнай будучыні. Але многія лічаць, што рабіць зберажэнні могуць дазволіць сабе толькі тыя, хто мае пастаянны і вялікі прыбытак. Гэта не так. Давайце ўспомнім нашых бабуль, якія на сціплыя пенсіі ўмудраюцца рабіць заначкі «на чорны дзень» і на падарункі для ўнукаў. І наадварот, ёсць людзі, якія маюць даволі высокі даход, але ў канцы месяца ў іх усё роўна нічога не застаецца, таму што яны прывыклі шмат траціць.

Калі штомесяц адпраўляць у скарбонку пэўную суму, праз некаторы час яна нечакана для вас ператворыцца ў нядрэнны капітал. Спецыялісты банкаўскай сферы рэкамендуюць адкладаць 10 % ад свайго даходу. Можна ўстанавіць і іншы памер у залежнасці ад сваіх магчымасцяў. Вазьміце за правіла: атрымаў зарплату, стыпендыю ці проста кішэнныя грошы ад бацькоў — адклаў звычайны працэнт. А калі выдалі незапланаваную прэмію, грашовы прыз ці падарунак, то можна выдаткаваць на «падушку» і больш. Адкладаць грошы ў канцы месяца — толькі тое, што засталося пасля ўсіх расходаў, — велізарная памылка, якую дапускае пераважная большасць. Пра фінансавы рэзерв варта клапаціцца ў першую чаргу.

Да падушкі бяспекі трэба ставіцца, як і да любых іншых рахункаў, абавязковых для аплаты. Важна папаўняць яе сістэматычна, каб выпрацаваць у сабе гэтую вельмі карысную звычку.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Наш доўг пакрысе зніжаецца

**Знешні дзяржаўны доўг нашай краіны на 1 лютага склаў 16,7 млрд долараў, знізіўшыся з пачатку года на 0,2 млрд долараў (з улікам курсавых розніц), або на 1,1 %, паведамляюць спецыялісты Міністэрства фінансаў.**

Пагашэнне знешняга дзяржаўнага доўгу ў студзені склала 299,2 млн долараў, з якіх 209,2 млн долараў — Экспартна-імпартнаму банку Кітая і 90 млн долараў — ураду Расіі. Дзяржаўная запазычанасць краіны на 1 лютага склала 44,9 млрд рублёў і павялічылася ў параўнанні з пачаткам года на 0,4 млрд рублёў. Унутраны дзяржаўны доўг па стане на пачатак апошняга месяца зімы склаў 8,9 млрд рублёў, зменшыўшыся з пачатку года на 8,7 млн рублёў. Эксперты Мінфіна адзначаюць, што ў студзені размяшчэнне ўнутраных дзяржаўных аблігацый для юрыдычных і фізічных асоб не ажыццяўлялася.


**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**о проведении аукциона**

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Агро-Оберег» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже **навеса № 2 для зерна КЗС общей площадью 89,3 кв. м с инв. № 602/С-55905, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 624484000001000025 (право постоянного пользования) площадью 0,1704 га по адресу: Минская область, Пуховичский район, Новопольский с/с, 7, около д. Гребень**. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав: *водоохранная зона р. Птичь, пл. 0,1704 га; охранная зона электрических сетей напряжением свыше 1000 вольт, пл. 0,0489 га.*

**Условия продажи:**

– улучшение эстетического вида объекта, благоустройство земельного участка, отведенного для обслуживания недвижимого имущества, и неведения на нем порядка, в течение трех месяцев с момента подписания акта приема-передачи недвижимого имущества;

– поддержание надлежащего санитарного, технического состояния недвижимого имущества и земельного участка в течение всего срока использования объекта до его сноса;

– обращение в течение одного месяца с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество в районный исполнительный комитет для получения разрешения на разработку проектно-санитарной документации, проведение проектно-изыскательских работ либо информирования соответствующего исполнительного комитета в указанный срок об отсутствия такой необходимости;

– разработка проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ в срок не позднее 6 месяцев с момента получения разрешения, если иное не предусмотрено законодательством;

– проведение реконструкции недвижимого имущества в сроки, предусмотренные проектно-сметной документацией, с окончанием строительства не позднее 2 лет с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество, если иное не установлено решением районного исполнительного комитета;

– исполнение земельного участка в строгом соответствии с действующим законодательством;

– запрет на отчуждение недвижимого имущества до его ввода покупателем в эксплуатацию.

**Начальная цена** с НДС (20 %) – **5 824,80** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **582,00** бел. руб.).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **02.04.2019** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **01.04.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17**



**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**о проведении аукциона**

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Рождественское-агро» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже **картофеле-сортировочного пункта «КСП-25» общей площадью 241,3 кв. м, инв. № 602/С-55981**, **расположенного на земельном участке с кадастровым номером 624487900001000020 (право постоянного пользования) площадью 0,5000 га по адресу: Минская область, Пуховичский район, Туринский с/с, возле д. Ананичи.** Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав: *охранная зона линии связи радиофикации, пл. 0,0260 га; охранная зона электрических сетей, пл. 0,0700 га; охранная зона, расположенная в природных полосах автомобильных дорог, пл. 0,5000 га.*

**Условия продажи:**

– улучшение эстетического вида объекта, благоустройство земельного участка, отведенного для обслуживания недвижимого имущества, и наведение на нем порядка в течение трех месяцев с момента подписания акта приема-передачи недвижимого имущества;

– поддержание надлежащего санитарного, технического состояния недвижимого имущества и земельного участка в течение всего срока использования (эксплуатации) объекта до его сноса (гибели);

– обращение в течение одного месяца с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество (в случае отчуждения незарегистрированного объекта – с даты подписания акта приема-передачи) в районный исполнительный комитет для получения разрешения на разработку проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ (в случае необходимости ее разработки) либо информирование соответствующего исполнительного комитета в указанный срок об отсутствии такой необходимости;

– разработка проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ в срок не позднее 6 месяцев с момента получения разрешения, если иное не предусмотрено законодательством;

– проведение реконструкции (строительства) недвижимого имущества в сроки, предусмотренные проектно-сметной документацией, с окончанием строительства не позднее 2 лет с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество, если иное не установлено решением районного исполнительного комитета;

– использование земельного участка в строгом соответствии с действующим законодательством;

– запрет на отчуждение недвижимого имущества до его ввода покупателем в эксплуатацию.

**Начальная цена** с НДС (20 %) – **24 120,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **2 412,00** бел. руб.).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 7 (семи) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **04.04.2019** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **03.04.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**



**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец имущества) в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснева Н. М. извещает о проведении 19 марта 2019 года открытого повторного аукциона по продаже имущества со снижением начальной цены на 60 % в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж**

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **ПРИМЕЧАНИЕ:** В соответствии с действующим Законодательством РБ (в части изменения подпункта 2.30 пункта 2 статьи 115 в Налоговом кодексе РБ с 1 января 2019 года) **реализация имущества осуществляется без учета НДС 20 %** | | | | |
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 311/С-35880** общей площадью **235,2 кв. м,** назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **учрежденческое здание. Капитальное строение с инв. № 311/С-32213** общей площадью **59,0 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **склад ГСМ. Капитальное строение с инв. № 311/С-1035** общей площадью **542,2 кв. м,** назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – **гараж. Капитальное строение с инв. № 311/С-1034** общей площадью **46,9 кв. м,** назначение – здание нежилое, наименование – **бытовка. Капитальное строение с инв. № 311/С-1038** общей площадью **45,6 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **мастерская. Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321250100001003512** общей площадью **0,4645 га (право постоянного пользования, доля в праве 1/1). Местонахождение:** Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, пер. Крылова, 4. **Целевое назначение земельного участка:** для обслуживания учрежденческого здания, здания гаража, бытовки, мастерской, склада ГСМ | **44 840,00** | 2 242,00 | 4 484,00 |
| 2 | **Капитальное строение с инв. № 311/С-1032** общей площадью **281,3 кв. м,** назначение – здание специализированное транспорта, наименование – **гараж. Капитальное строение с инв. № 311/С-1043** общей площадью **61,4 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **здание проходной. Капитальное строение с инв. № 311/С-1041**, общей площадью **893,8 кв. м,** назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – **здание столярно-пилорамного цеха. Капитальное строение с инв. № 311/С-1039** общей площадью **73,6 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **РБУ. Капитальное строение с инв. № 311/С-1037** общей площадью **99,2 кв. м,** назначение – здание специализированное лесохозяйственного назначения, наименование – **лесосушилка. Капитальное строение с инв. № 311/С-1036** общей площадью **499,8 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **склад. Капитальное строение с инв. № 311/С-1040** общей площадью **47,7 кв. м,** назначение – здание нежилое, наименование – **бытовка.**<br>**Капитальное строение с инв. № 311/С-1033** общей площадью **114,5 кв. м,** назначение – здание обрабатывающей промышленности иного назначения, наименование – **арматурный цех. Капитальное строение с инв. № 311/С-34650** общей площадью **0,0 кв. м,** назначение – сооружение благоустройства, наименование – **забор вокруг базы ПМК-95** (сооружение забора вокруг базы ПМК-95 протяженностью 585,72 м). Недвижимое улучшение – **асфальтобетонная площадка (полигон ж/б изделий)** (без учета пропарочной камеры). Недвижимое улучшение **– ворота. Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321250100001003513** общей площадью **2,3313 га (право постоянного пользования, доля в праве 1/1). Местонахождение:** Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, пер. Крылова, 4. **Целевое назначение земельного участка:** для обслуживания здания проходной, бытовки, столярно-пилорамного цеха, лесосушилки, гаража, РБУ, склада, арматурного цеха, уборной, ворот и асфальтобетонной площадки(полигон ж/б изделий) | **89 240,00** | 4 462,00 | 8 924,00 |
| 3 | **Капитальное строение с инв. № 311/С-34652**, общей площадью **56,5 кв. м,** назначение – погреб, наименование – **погреб. Капитальное строение с инв. № 311/С-1044** общей площадью **185,4 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **склад. Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321250100001000216** общей площадью **0,3392 га (право постоянного пользования, доля в праве 1/1). Местонахождение:** Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, пер. Крылова, 4. **Целевое назначение земельного участка:** земельный участок для обслуживания производственной базы | **13 640,00** | 682,00 | 1 364,00 |

**Продавец:** ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука,12. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве Колеснев Николай Михайлович; 8 (044) 769-19-61, 8 (0232) 53-27-62 – по недвижимости Яроцкая Людмила Николаевна. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1**. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, ОКПО 285728963000, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 1 марта 2019 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 15 марта 2019 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 5 (пять) дней до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором торгов** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество, согласно договора купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента его подписания и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» ст. 127–129. **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 05.09.2018 г. № 170 (28786). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029)126-66-62**

## Тэлесеткі

### МАДЭЛЬЕР ДЛЯ «ПЕРШАЙ КНОПКІ»

Белтэлерадыёкампанія абвясціла творчы конкурс на стварэнне новага візуальнага вобраза тэлеканала «Беларусь 1» і яго самых вядомых інфармацыйных перадач — «Панарама», «Галоўны эфір», «Спецыяльны рэпартаж», «Актуальнае інтэрв'ю» і іншых. Пераможца, адзначаючы у медыяхолдынгу, не толькі ўбачыць увасабленне сваіх эскізаў на экране, але і будзе адзначаны грашовым прызам у памеры 10 тысяч беларускіх рублёў.

Як пазначана ў палажэнні на афіцыйным сайце Белтэлерадыёкампаніі, удзельнікам конкурсу трэба распрацаваць унікальную графіку і адметныя, лёгка пазнавальныя стыль для тэлеканала, які, з аднаго боку, не будзе супярэчыць ужо складзенаму за гады працы «строгаму» іміджу, а з другога — адлюструе сучасную скіраванасць і дынамічнае развіццё «Беларусь 1». Пры гэтым арганізатары забаранілі скарыстанне ўжо існуючага лагатыпа (ён, дарэчы, існуе з восені 2011 года), а таксама гатовых рашэнняў, якія ўжо скарыстоўваліся ў дызайне тэлеканала, асобных праграм і перадач, альбо змяшчаліся ў адкрытым доступе ў сеціве.

Матэрыялы для ўдзелу ў конкурсе не пазней за 22 сакавіка 2019 года неабходна дасылаць на электронную пошту tvr@tvr.by ці на адрас: вул. Макаёнка, 9, 220014, г. Мінск, з пазнакай «Творчы конкурс «Беларусь 1». Вынікі творчага спаборніцтва мастацкая рада БТРК падвядзе цягам тыдня.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

## Запрашальнік

### Пяты фестываль «Горад і Кнігі» пройдзе ў Мінску ў красавіку

Гарадскі кніжны фэст для аматараў чытання, які штогод ладзяць Беларуская бібліятэчная асацыяцыя, Навуковая бібліятэка БНТУ і праект «ЗаЧытанне», сёлета пройдзе ў сталіцы 19—20 красавіка.

Як плануюць арганізатары, у гэтым годзе яго спецыяльнымі гасцямі будуць украінская пісьменніца ў жанры падлеткавага фэнтэзі, аўтар серыі «Часадзеі» Наталля Шчэрба, прафесійны мастак-ілюстратар, член Саюза мастакоў Расіі Антон Ламаеў і галоўны рэдактар літаратурнага выдання «Горький» Канстанцін Мільчын. Майстар-класы для мастакоў, блогераў і крытыкаў, чытанні на розных мовах з удзелам беларускіх артыстаў, літаратурная інтэлектуальная гульня-квіз, адмысловая чайная гасцёўня — агулам у праграме фестывалю больш як 100 разнастайных мерапрыемстваў. Адбудуцца яны па традыцыі на пяці пляцоўках: дзіцячай, маладзёжнай, пляцоўцы экспертных сустрэч, пляцоўцы гучных чытанняў і выстаўцы хэнд-мэйд-герояў сучасных кніг «Усмешлівыя цуды».

Зыходзячы з вопыту мінулых гадоў, «Горад і Кнігі» чакае не менш чым 8000 наведвальнікаў. Каб іх не расчараваць і выканаць усё запланаванае, арганізатары распачалі на пляцоўцы ulej.by краўдфандынгавую кампанію па падтрымцы валанцёрскага фестывалю. У тэрмін да 7 красавіка кожны ахвотны можа далучыцца да спонсараў мерапрыемства і атрымаць не толькі падзяку, але і памятны падарунак. «Мы перакананыя, што ў кожным горадзе мусіць быць кніжны фестываль, і Мінск гэтага дакладна заслугоўвае. Няхай добрыя аўтары і выдавецтвы прыязджаюць да нас усё часцей!» — гаворыць **адна з аўтараў і куратараў праекта Вольга ВОЎК.**

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

## ШАШКІ («Звязда») Выпуск № 83

Майстар спорту міжнароднага класа Дзмітрый Фадзееў стаў пераможцам чэмпіянату горада Мінска па рускіх шашках сярод мужчын з парушэннем зроку. Другое месца ў майстра Н. Антосікава, на трэцім — кандыдат у майстры Н. Зотаў. У турніры жанчын перамагла Ірына Чарэднічэнка, другой фінішавала Таццяна Аніканава. Трэцяе месца — у Ірыны Пархамовіч.

У спаборніцтвах па рускіх шашках сярод ветэранаў, прысвечаных 23 лютага, узялі ўдзел 18 шашыстаў. Перамог міжнародны гросмайстар Аркадзь Плакхін — 14 ачкоў з 18 магчымых. На другім месцы майстар В. Палянскі — 13 ачкоў. Трэцім фінішаваў кандыдат у майстры А. Шушкевіч — 12 ачкоў.

Паглядзіце цікавы прыклад гульні.

**№ 14** С. Супрунюк — В. Палянскі



**Белыя простыя шашкі:** a1, b2, c1, d2, e5, f2, f4, h2, h4 (9).

**Чорныя простыя шашкі:** a3, a5, b8, c5, d8, e7, g7, h6, h8 (9).

Майстар, які гуляў чорнымі, нанёс кінжальны ўдар. Паспрабуйце адшукаць шлях да перамогі за чорных самастойна.

Для самастойнага рашэння прапануюцца кампазіцыі, складзеныя вядучым аддзела.

**№ 15**

**Белыя простыя шашкі:** b6, c5, c7, f6 (4).

**Чорныя простыя шашкі:** a5, c3, d4, d8, e3, e7 (6).

**№ 16**

**Белыя простыя шашкі:** b6, c5, c7, f4, h4 (5).

**Чорныя простыя шашкі:** a5, b2, d2, e3, e7, f2, f6, g7, h6 (9).

**№ 17**

**Белыя простыя шашкі:** b6, c5, c7, f4, h4 (5).

**Чорныя простыя шашкі:** d2, e3, f2, f6, g7, чорныя дамкі a5 (6).

**№ 18**

**Белыя простыя шашкі:** 26, 30, 31, 32, 37, 44, 45, 49 (8).

**Чорныя простыя шашкі:** 7, 8, 14, 16, 17, 18, 22, 25, 29 (9).

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць.

Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Праверце свае рашэнні: выпуск № 82 ад 15.02.2019.

**№ 10** 1. gh4 (паграджае 2. cd4) 2...cd4 3. cb2 df6 4. cd4 ag5 5. de5+

**№ 12** 19, 5 (~) 28, 5-23, 5 (23/14/10 A) 26+ A(19)24(19) 26+

**№ 13** 30, 23, 43, 18, 1, 22 x

Дакладныя адказы даслалі С. Рашэцін (Ашмяны), В. Дударэвіч (в. Новая Мыш Баранавіцкага раёна), Ф. Карпей (Мядзел), У. Статкевіч (п. Зялёны Бор Івацэвіцкага раёна), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), А. Шурпін (Івянец), В. Ваўчкоў (Маладзечна), П. і В. Шульгі, А. Ліцьвінаў (усе Мінск), В. Таўкачоў (Клімавіцкі р-н), В. Бандарык (Мінскі раён).

Пішыце на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск, e-mail: info@zviazda.by, або vorush@yandex.ru.

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**





# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ




## Тры нагоды ўключыць тэлевізар

### БАЛЕТ

Спецыяльна да традыцыйнага вясенняга свята сацыякультурны канал «Беларусь 3» падрыхтаваў тэатральны падарунак — 8 сакавіка гледачы ўбачаць тэлеверсію балета Вялікага тэатра «Рамэа і Джульета» ў новай аўтарскай рэдакцыі народнага артыста СССР і Беларусі, знакамітага балетмайстра Валянціна Елізар'ева. Прэм'ера гэтай пастаноўкі адбылася толькі ў снежні мінулага года, а на тэлебачанні пастаноўка будзе прадстаўлена ўпершыню. «На здымках спектакля была задзейнічана адна з новых найсучасных перасоўных тэлестанцый, — адзначаюць у Белтэлерадыёкампаніі, — таму аб'ектывы зафіксавалі літаральна кожны рух артыстаў і атрымалася паўнавартасная карціна, якую не заўжды разгледзіш, седзячы ў зале».



Харэаграфія Елізар'ева заўжды вызначалася наватарскім падыходам. Так, яшчэ ў 1988 годзе ў кананічны сюжэт «Рамэа і Джульеты» Уільяма Шэкспіра ён увёў цалкам новы вобраз, які дагэтуль не вылучаў ніводны аўтар лібрэта і пастаноўшчык — персаніфікаваную Варожасць, якую паказвалі ажно шасцёра артыстаў. Аншлагавы спектакль беларуская трупа прадставіла за гэтыя гады ў больш чым 20 краінах свету. Рэнавацыя ж, паводле водгукаў крытыкаў і гледачоў, атрымалася не толькі відовішчнай дзякуючы новым дэкарацыям, але і яшчэ больш драматычнай, глыбокай і па-ранейшаму актуальнай «найсумнейшай аповесцю ў свеце».

### ДАЧА

Шосты сезон папулярнага тэлепраекта «Дача», які здымае ТРК «Магілёў», стартуе ў эфіры «Беларусь 1» 2 сакавіка. Што ў ім будзе новага? Перш за ўсё вядучая. Кампанію аператару Юрыю Аўласцову ў падарожжы па «фазэндах» беларускіх дачнікаў цяпер складае Алена Іванова, бо Таццяна Ларына, якая палюбілася аўдыторыі за мінулыя пяць гадоў, перайшла на адміністрацыйную работу — летась узначаліла абласную магілёўскую тэлерадыёкампанію.

Да пастаянных рубрык праграмы ў новым сезоне дабавіцца інтэрактыўная гульня «Простая задача»: у пачатку праграмы гледачам зададуць пэўныя пытанні і дадуць падказкі, а напрыканцы — раскрыюць правільны адказ і дапоўняць яго малавядомымі фактамі па тэме. А яшчэ стваральнікі «Дачы» даюць зацікаўленым кансультацыі і прымаюць ад гледачоў расказы пра наватарскія распрацоўкі — праз электронную пошту dacha@tvrmogilev.by.

Асноўная канцэпцыя праграмы не змянілася: тэлевізійнікі па-ранейшаму прапануюць вопытным гаспадарам дзяліцца карыснымі парадамі і садова-агароднымі хітрыкамі, а навічкоў «шасці сотак» знаёмяць з цікавымі сартамі раслін, што толькі з'яўляюцца ў нашай краіне, і разам са спецыялістамі вывучаюць з розных бакоў традыцыйныя культуры.



У першым выпуску «Дачы» 2019 года пройдзе майстар-клас, як правільна пікіраваць і саджаць эўстому — трапічную расліну, якая нядрэнна прыжываецца ў беларускім клімаце і дапаможа зрабіць дачны ўчастак больш яркім і цікавым.

### ВОСТРАЎ

Калі вы даўно марылі ўзяць тэлевізійных экстрасэнсаў ды адправіць усіх гуртам кудынебудзь як мага далей ад звычайных людзей, лічыце, ваша мара збылася: з 2 сакавіка на канале ТБ-3 пачынаецца рэаліці-шоу «Апошні герой. Зоркі супраць экстрасэнсаў».



Яго ўдзельнікі — «племя акцёраў», сярод якіх Ірына Бязрукава, экс-удзельніца Comedy Woman Наталля Мядзведзева, Артур Смальянінаў і іншыя, а таксама «племя экстрасэнсаў» — удзельнікі «Бітвы экстрасэнсаў» на ТНТ. Абодвум плямёнам трэба пратрымацца 39 дзён на пяцібалюдных высах, праўда, не ў суровым клімаце, а ў тропіках, на Філіпінах, затое ў кампаніі з марскімі змеямі, скарпіёнамі і ядавітымі медузамі. Штодня ўдзельнікі атрымліваюць толькі літр вады з разліку два літры на чалавека, а ежу трэба здабываць самім, пры гэтым выконваючы разнастайныя заданні арганізатараў. Дарэчы, на сёння міжнародны фармат «Апошняга героя», вядомы таксама пад назвамі «Экспедыцыя Рабінзон» і «Выжыўшы», адаптаваны ў розных краінах свету больш чым 40 разоў, а самая папулярная версія праекта выходзіць у ЗША ўжо 37 сезонаў запар.

### Не дзіва, што зносак спудлуе...

**Свой, адметны чытач у газеты «Звязда». Ён жа, хочацца верыць, глядач тэлеканала «Беларусь 3» і ў прыватнасці праграмы «Размаўляем па-беларуску». Гэтая тэлевіктарына ужо каторы год у эфіры і магла б выходзіць далей — у звычным фармаце. Аднак стваральнікі вырашылі ўдасканаліць яго (над чым і працуюць)...**

А пакуль усе, хто цікавіцца мовай, шануюць яе і, магчыма, плануюць удзел у віктарыне, могуць праверыць сваё веданне з дапамогай «Звязды». Такім чынам,

**ці ведалі вы, што:**

**гу́жам** — 1) на калёсах або санях; 2) чарадой, адзін за адным;

**зно́сак** — 1) маленькае, звычайна апошняе, курынае яйка; 2) пра слабага, нікуды не вартага чалавека;

**капы́л** — 1) кавалак дрэва ў форме ступні, на якім шавец робіць абутак; 2) адзін з драўляных брускоў, якія ўстаўляюцца ў палазы і служаць апорай для кузава саней;

**пу́дла** — промах у стральбе, няўдалы стрэл;

**спіча́сты** — з вострым верхам або канцом;

**цвяліць** — 1) дражніць, раздражняць, выклікаць зайздрасць, хваляваць, расчульваць каго-небудзь; 2) выклікаць якія-небудзь пачуцці, надзеі, жаданні;

**цуг** — 1) доўгі рад, чарада жывёл, птушак, машын, якія рухаюцца адна за адной; 2) запрэжка, у якой коні ідуць гужам або парамі адзін за адным;

**пудла даць** — не пацэліць, прамахнуцца; памыліцца (беларускія сінонімы: *не на тую нагу бот надзець, схібіць, спудлаваць;* рускі адпаведнік: *дать маху);*

**да абуха дабіць (давесці)** — давесці да развалу, прывесці ў непрыгодны стан (беларусы яшчэ скажуць: *да пухі дабіць, на пусты канец звесці, на пшык звесці;* руская: *довести до ручки).*

## Беларусь 1

**6.25** «Існасць».
**6.50, 21.45 Меладрама «Яе сакрэт». 1—4-я серыі (16+).**
**8.25** «Кулінарная дыпламатыя» (12+).
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** «Маршрут пабудаваны». Баранавічы (12+).
**9.45** «Здароўе» (12+).
**10.35** «Дача» (12+).
**11.15, 12.10 Меладрама «Мамы» (12+).**
**13.30** «Я ведаю» (6+).
**15.15** «Краіна».
**15.45 Меладрама «Нераскрыты талент». 1—4-я серыі (16+).**
**20.00** «Макаёнка, 9».
**21.00** «Панарама».
**1.00 Серыял «Сваты-6» (12+).**
**1.50** «Дзень спорту».

## Беларусь 2

**7.00** М/с «Машыны казкі» (0+).
**7.25** М/с «Кунг-фу панда: захапляльныя легенды» (12+).
**8.40, 21.55** «Тэлебарометр».
**8.45** Анімацыйны фільм «Рапунцэль. Заблытаная гісторыя» (12+).
**10.25, 0.15** «Хто я?» (12+)
**10.45** «Капейка ў капейку» (12+).
**11.20** «Камень, нажніцы, папера» (16+).
**11.55** «Паненка-сялянка» (16+).
**12.45** «Да пабачэння» (16+).
**13.40 Меладрама «Красуня» (12+).**
**15.40** «Блізняты» (16+).
**16.35** «Тата напаў» (16+).
**18.15 Камедыя «Жаніх напракат» (12+).**
**20.10 Фантастыка «Прывід у даспехах» (16+).**
**22.00** «Спортлато 6 з 49», КЕНО.
**22.05 Баявік «Місія невыканальная. Пратакол Фантом» (12+).**

## Беларусь 3

**7.35** «Сіла веры».
**8.00, 14.00, 20.15** Навіны культуры.
**8.20, 14.20, 20.30** «Гэты дзень».
**8.25 «Упершыню замужам». Меладрама (12+).**
**10.00** «Жывая культура». Творчасць майстроў-шапавалаў (Дрыбінскі раён, Магілёўская вобласць).
**10.30** «Беларуская кухня». Боршч з клёцкамі.
**10.55** «Спявае Беларусь».
**11.45 «Дзяржаўная граніца». Маст. фільм «Кур'еры страху» (12+).**
**13.35** «Навукаманія» (6+).
**14.25** Юбілейны канцэрт ансамбля народнай музыкі «Бяседа».
**15.55 «Вясна на Зарэчнай вуліцы». Меладрама (12+).**
**17.30** «Доказы з мінулага». Напалеон (16+).
**18.10 «Вазьму твой боль». Драма (12+).**
**19.35** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
**20.00** «Суразмоўцы».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05 «Каханне з акцэнтам». Камедыя (12+).**
**22.45** Бенефіс Рыгора Палішчука да 30-годдзя творчай дзейнасці.

## Беларусь 5

**7.00, 22.30** Тэніс. WTA. Індыян-Уэлс.
**10.50** Біятлон. Чэмпіянат свету. Эстэрсунд. Спрынт. Жанчыны.
**12.10** Вялікі спорт.
**12.55** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1/8 фіналу. Першыя матчы. Агляд.
**13.50** Футбол. Кубак Беларусі. 1/4 фіналу.
**16.00** Спорт-мікс.
**16.10** Гандбол. SEHA — Газпрам ліга. БГК імя Мяшкова (Беларусь) — «Заграб» (Харватыя). (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**17.55** Спорт-цэнтр.
**18.05** Біятлон. Чэмпіянат свету. Эстэрсунд. Спрынт. Мужчыны.
**19.30** Трэніровачны дзень.
**20.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**20.30** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Манчэстэр Сіці» — «Уотфард».

## АНТ

**7.00, 9.00, 16.00** (з субцітрамі) «Нашы навіны».
**7.10** «Іграй, гармонь любімая!» (6+)
**8.00** Да 85-годдзя Юрыя Гагарына. «Зорка па імені Гагарын» (12+).
**9.10 Камедыя «Пустая марнасць» (0+).**
**11.00** «Хіт на сняданак».
**11.45** «Аляксей Баталаў. «Як доўга я цябе шукала...» (12+)
**13.00 Меладрама «Масква слязам не верыць» (6+).**
**16.20** «100 імёнаў Беларусі». «Зігмунд Урублеўскі. Гарачы кісларод» (12+).
**17.20** «Эксклюзіў» (16+).
**19.00, 21.10** «Сёння ўвечары» (16+).
**20.00** «Нашы навіны». Суботні выпуск.
**20.45** «Метэагід».
**21.05** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**23.20 Маст. фільм «Гагарын. Першы ў космасе».**

## СТБ

**6.25** «Жывая тэма» (16+).
**8.00** «Анфас».
**8.20** «Самая карысная праграма» (16+).
**9.15** «Мінтранс» (16+).
**10.00** «Мінск і мінчане».
**10.35** «Цэнтральны рэгіён».
**11.05, 13.45, 16.45, 20.05 «Лепш не бывае». Серыял (12+).**
**13.30, 16.30, 19.30** Навіны «24 гадзіны».
**19.55, 22.55** «СТБ-спорт».
**23.30** Дакументальны праект (16+).
**0.20 Меладрама «Будзьце маім мужам» (6+).**

## МІР

**6.05, 8.05** М/ф (0+).
**6.15** «Мільён пытанняў аб прыродзе» (6+).
**6.30** «Саюзнікі» (12+).
**7.05** «Такія розныя» (16+).
**7.35** «Сакрэтныя матэрыялы» (16+).
**8.55** «Вой, мамачкі!» (12+)
**9.25** «Народжаны ў СССР. Юрый Гагарын» (12+).
**10.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Як у рэстаране» (12+).
**10.45, 12.20, 14.00, 15.35, 16.15, 18.00, 19.15, 20.35, 23.05** Серыял «Тайны палацавых пераваротаў» (12+).
**2.40 Маст. фільм «Нерэальнае каханне» (12+).**
**4.05 Маст. фільм «Каханы Раджа» (16+).**

## РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Беларусі».
**10.00** «Смяяцца дазваляецца» (16+).
**11.00 Маст. фільм «Час кахаць» (12+).**
**14.20 Камедыя «Утаймавальніца тыграў» (0+).**
**16.15 Маст. фільм «Зламысніца» (12+).**
**19.45** «Плюс мінус». Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі.
**20.30** «Прывітанне, Андрэй!» (16+)
**22.30 Маст. фільм «Золатка» (12+).**

## НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00** Terra incognita. Беларусь невядомая (6+).
**6.30** «Зразумець і абясшкодзіць» (12+).
**7.00, 8.20 Серыял «Ціхі цэнтр» (12+).**
**8.00, 10.00, 16.00** Сёння.
**9.25** «Урачэбныя тайны плюс» (12+).
**10.25** Галоўная дарога (16+).
**11.10** «Ежа жывая і мёртвая» (12+).
**12.10** Кватэрнае пытанне (0+).
**13.10** «НашСпажыўНагляд» (16+).
**14.05 Серыял «Кветкі зла» (16+).**
**16.30** «Следства вялі...» (16+)
**17.10** «Сакрэт на мільён». Міхаіл Цыскарыдзэ (16+).
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**20.25 Серыял «Пёс» (16+).**
**23.15** «Аднойчы...» (16+)
**23.55** «Брэйн-рынг» (12+).

## 8 канал

**7.00, 18.50, 21.20, 0.55** «Надвор'е».
**7.05** М/ф «Баранчык Шон».
**7.15** Дак. серыял «Міфы і пачвары».
**8.00** М/ф «Упс».
**9.25** «Утрамдзія».
**9.30 Меладрама «Масква слязам не верыць» (12+).**
**12.00 Камедыя «Каханне і галубы» (12+).**
**13.45 Драма «Рабыня кахання» (0+).**
**15.15** «Адказвайка» (0+).
**15.20** «Глядзім усёй сям'ёй». М/ф «Красная шапка супраць зла».
**16.50 Меладрама «Маленькая міс шчасце» (16+).**
**18.35** «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**18.55 Камедыя «Сэрцаедкі» (16+).**
**20.55** «Вечарніца» (0+).
**21.05** «Фэшн is my прафэшн».
**21.25 Драма «Жывы дзеля нас» (16+).**
**23.25 Камедыя «Прыкінься маім хлопцам» (16+).**






## ВТБ

**6.05, 20.00** Серыял «Дзяўчынкі не здаюцца» (16+).
**6.55, 2.45** «Галерэя прыгажосці» (16+).
**7.35** М/ф «Чычылэнд» (0+).
**7.55** М/ф «Тры каты» (0+).
**8.20** М/ф «Маша і Мядзведзь» (0+).
**8.55** «Ералаш» (6+).
**9.25, 17.40** «Уральскія пельмені» (16+).
**10.25, 18.40** Серыял «Шчаслівыя разам» (16+).
**11.50, 3.10** «Рублёва-Бірулёва» (16+).
**12.50** Серыял «Вароніны» (12+).
**14.45, 1.05** Скетч-шоу «Адна за ўсіх» (16+).
**15.45** Баявік «Анёлы Чарлі» (16+).



**21.00** Серыял «Пекар і прыгажуня» (16+).
**22.00** Баявік «Анёлы Чарлі-2: толькі наперад» (16+).
**0.05** Серыял «Людзі Хэ» (16+).
**1.30** Серыял «Бязмоўны сведка» (16+).
**4.00** «Дурні і дарогі» (16+).
**5.00** «Лаві момант» (16+).

## Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.45** Навіны культуры.
**6.35** «Пешшу...» Масква дваровая.
**7.05, 20.05** «Правілы жыцця».
**7.35** «Тэатральныя летапіс». Эдуард Марцэвіч.
**8.00** «Сіта і Рама». Серыял.
**8.50** «Усходні дантыст». Маст. фільм. 2-я серыя.
**10.15** «Назіральнік».
**11.10, 1.20** ХХ стагоддзе. «На будоўлях Масквы». Дак. фільм. «На ўскраінах Масквы». Дак. фільм.
**12.10** Сусветныя скарбы.
**12.25, 18.40, 0.35** «Тым часам. Сэнсы».
**13.15** «Мы — грамацеі!»
**14.00** «Першыя ў свеце». Дак. серыял.
**14.15, 2.15** «Каця і прынц. Гісторыя адной выдумкі». Дак. фільм.
**15.10** «Эрмітаж».
**15.40** «Белая студыя».
**16.25, 22.20** «Дом мадэляў».
**16.55** Прымадоны сусветнай опернай сцэны. Марыя Гулегіна.
**19.45** Галоўная роля.
**20.30** «Добрай ночы, малышы!»
**20.45** «Сусвет Стывена Хокінга». Дак. серыял.
**21.30** Да юбілею Ларысы Лужынай. «Лінія жыцця».
**22.50** «Медычы. Уладары Фларэнцыі». Серыял (18+).
**0.05** «Адлюстраваны час». Дак. серыял.

## Настальгія

**6.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**6.50, 8.40, 11.20, 12.50, 14.25, 15.45, 17.00, 18.50, 20.35, 21.45, 23.00, 0.45, 2.40, 5.20** Музычная настальгія (12+).
**7.10** «Вакол смеху». 1979 год (12+).
**9.00** Маст. фільм «Вяртанне» (16+).
**12.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Рэстаранная культура». 2005 год (18+).
**13.15, 19.20** Маст. фільм «Шлях да сябе» (16+).
**14.50** М/ф «Ух ты, рыба, якая размаўляе!» (12+)
**15.00, 21.00** «Мінулы час» (12+).
**18.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Савецкі Саюз і класіка». 2007 год (16+).
**23.15** Тэлефільм «А. П. Чэхаў. «Сцэнкі». 1973 год (12+).
**0.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1957-ы. 4-я частка. 2009 год (12+).
**1.00** Маст. фільм «Вясна» (12+).
**3.00** «Быў час». 2009 год (16+).
**4.00** Маст. фільм «Былы тата, былы сын» (18+).

## EuroSport 1

**1.35** Веласпорт (трэк). Чэмпіянат свету.
**3.00, 16.00** Дзюдо. Вялікі шлем.
**3.30, 7.00, 12.30, 19.35** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету.
**5.00, 8.30, 14.00, 21.55** Снукер. Players Championship.
**10.30, 16.30** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў памяшканні.
**11.30** Універсіяда.
**17.30** Веласпорт. Ле-Самен.
**19.30** Хакей на траве. Pro Leagues.
**21.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Чэмпіянат свету.

## Кінакамедыя

**1.10** Каханне прэт-а-партэ (12+).
**2.55** Лёгкія паводзіны (16+).
**4.45** Містар Фелічыта (16+).
**6.25** Скарбы В. К. (12+).
**8.35** Ушчэнт (16+).
**10.20** Найлепшыя і самы яркі (16+).
**12.05** Паслявясельны разгром (18+).
**13.55** Нічога не бачу, нічога не чую (16+).
**15.55** Сексаголік (16+).
**17.35** Сведка на вяселлі (16+).



**19.30** Сцерва (16+).
**21.20** Гэта ўсё яна (16+).
**23.10** Кур'ер (16+).

## ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**7.10** «Школа доктара Камароўскага» (6+).
**7.50** «Доктар І...» (16+).
**8.20, 19.05, 2.30** «Асколкі». Серыял (16+).
**10.00, 23.10** «Улегцы» (12+).
**10.35, 4.00** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**12.20, 17.50** «Варажбітка» (12+).
**13.25, 16.45** «Містычныя гісторыі» (12+).
**14.20** «Простыя складанасці» (12+).
**14.55** «Арол і рэшка. Па морах» (16+).
**15.55** «Натуральны адбор» (12+).
**20.55** «Арол і рэшка. Перазагрузка» (16+).
**22.00** «Уся праўда» (16+).
**22.35, 5.30** «Вокладка» (16+).
**23.40** «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
**0.25** «К-19». Камедыя (12+).

## ТБ1000

**6.10, 15.15** Малавіта (16+).
**8.20** Сфера (16+).
**10.30** Малая на мільён (16+).



**13.15** Маё вялікае грэчаскае вяселле-2 (16+).
**17.30** Павуцінне хлусні (16+).
**20.10** Бэтмен: пачатак (12+).
**22.55** Аляксандр (16+).
**2.15** Афера па-англійску (18+).
**3.55** Госця (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Мамы (12+).
**8.25** Іронія кахання (16+).
**10.10** Аб чым маўчаць дзяўчаты (12+).
**11.55** Я кахаць цябе буду, можна? (12+)
**13.05** Кантрыбуцыя (12+).
**16.20, 4.20** Парфумерка (12+).
**18.30** Агні вялікай вёскі (12+).
**20.20** Часовыя цяжкасці (12+).
**22.10** На кручку! (16+)
**0.05** Стальны матылёк (16+).
**2.15** Час пік (16+).

## National Geographic

**0.00, 23.50** Дзіўная Другая сусветная (16+).
**0.45, 13.25** Асушыць акіян (16+).
**1.30, 4.50, 9.40** Закінутыя скарбы Егіпта (16+).
**2.20, 16.40** Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
**3.10, 15.55** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**4.00, 8.05, 17.30, 21.30** Аўта-SOS (16+).
**05.35** Зона будаўніцтва (16+).
**6.00** Гульні розуму (16+).
**6.30** Панарама 360 (16+).
**7.20** Скануючы час (16+).
**10.25** Выпрабаванне пустыні (16+).
**11.10** Дзікі тунец (16+).
**12.40** Адкрыццё страчанай магілы Ірада (16+).
**14.15, 19.45, 23.00** Тайныя гісторыі (16+).
**15.05, 20.35** Геній (16+).

## Discovery

**8.00, 16.00, 22.00** Махінатары.
**9.00, 17.00, 23.00, 4.40** Круты цюнінг.
**10.00, 15.00, 21.00** Як гэта ўстроена?
**11.00, 20.00, 5.30** Паляўнічы на антыкварыят.
**12.00** Погляд знутры.
**13.00** Круты Чэд.
**14.00, 3.50** Легендарныя японскія аўто.
**18.00** Разбуральнікі легенд.
**19.00** Рэальныя дальнабойшчыкі.
**0.00** Злачынцы Трэцяга рэйха.
**1.00, 6.20** Бітвы робатаў.
**2.00, 7.10** Скрозь кратовую нару.
**2.55** Музейныя тайны.

### Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 «Добрай раніцы, Беларусь!»
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.15 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 18.15, 23.55 «Зона Х» (16+).
8.50 Слова мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча на пачатак Вялікага посту.
9.10, 22.05 **Серыял «След» (16+).**
10.45, 12.10, 18.35, 19.20 **Серыял «Шчаслівы білет» (16+).**
13.05 «Дзіцячы доктар».
13.35 «Дзень у вялікім горадзе».
14.35, 15.25 **Меладрама «Каханне нечаканае нойдзе». 3—4-я серыі (12+).**
15.15, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 «Беларуская часінка».
21.00 «Панарама».
21.50 «На кантролі Прэзідэнта».
23.35 «Сфера інтарэсаў».
0.35 «Дзень спорту».

### Беларусь 2

7.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 17.30 «Тэлебарометр».
9.05, 20.05 **Серыял «Сляпая» (16+).**
10.00, 22.20 «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
11.00, 17.35 **Серыял «Следства кахання» (16+).**
12.40, 23.25 **Серыял «Тэст на цяжарнасць» (16+).**
13.45 «Муж напракат» (16+).
14.45 «Паненка-сялянка» (16+).
15.40 «Нічога сабе ньюз» (12+).
15.45, 0.20 «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект (12+).
16.30 «Веру не веру» (16+).
19.15 «Арол і рэшка. Кругасветка» (16+).
21.00, 22.05 «Абмен жонкамі» (16+).
22.00 «Спортлато 5 з 36», КЕНО.

### Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35 «Беларуская кухня». Свіное калена па-аўцюкоўску.
8.05, 12.00, 20.15 Навіны культуры.
8.20, 12.15, 20.30 «Гэты дзень».
8.25, 17.15 **«Узнятая цаліна». Маст. фільм (12+).**
10.05, 16.00 **«Доктара выклікалі?» Маст. фільм (12+).**
11.25, 21.05 «Апошні дзень». Рыма Маркава (12+).
12.20 «Жывая культура». Традыцыйная тэхналогія ткацтва падвойных дываноў (в. Гудзевічы, Мастоўскі раён, Гродзенская вобласць).
12.50 «Спявае Беларусь».
13.45, 21.45 **«Маёр Ветраў». Маст. фільм (16+).**
14.35, 22.35 «Гісторыя міліцыі ў асобах» (12+).
15.20, 18.55 «Авіяносныя караблі Савецкага Саюза». Дак. фільм (12+).
19.35 «Беларуская кухня». Цымес.
20.00 «Суразмоўцы».
20.40 «Калыханка» (0+).
23.25 «Запіскі на палях». Францыск Скарына: чытаючы гравюры...

### Беларусь 5

7.00 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Матч у адказ. «Барусія» (Дортмунд, Германія) — «Тотэнхэм» (Англія).
9.00, 0.45 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Дзённік гульнявога дня.
9.30 Гандбол. SEHA — Газпрам ліга. «Вардар» (Македонія) — БГК імя Мяшкова.
11.05, 13.50 Спорт-мікс.
11.15 Хакей. КХЛ. 1/4 фіналу. Заходняя канферэнцыя. Пяты матч.
13.20 Спорт-кадр.
14.00 Хакей. КХЛ. 1/4 фіналу. Усходняя канферэнцыя. Пяты матч.
16.05 Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
16.35 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Матч у адказ. «Рэал» (Іспанія) — «Аякс» (Нідэрланды).
18.30 Козел пра футбол.
18.50 Хакей. Чэмпіянат Беларусі. 1/4 фіналу. Першы матч. (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
21.10 Легенды сусветнага спорту.
21.40 Слэм-данк.
22.10 Агнявы рубеж.
22.40 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Матч у адказ. ПСЖ (Францыя) — «Манчэстэр Юнайтэд» (Англія). (У перапынку — Спорт-цэнтр.)

### АНТ

6.00, 7.05, 8.05 «Наша раніца».
7.00 (з субцітрамі), 8.00 (з субцітрамі), 9.00 (з субцітрамі), 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), 20.30 Нашы навіны.
9.10 «Жыць здорава!» (16+)
10.20, 11.10 **Серыял «Дэтэктывы» (16+).**
11.50 «Модны прыгавор» (12+).
13.10 **Серыял «Гюльчатай» (16+).**
15.00 «Давай пажэнімся!» (16+)
16.20 «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
17.25, 18.20 «На самай справе» (16+).
18.50 «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
18.55 «Няхай гавораць» (16+).
20.00 «Час».
21.10 **Серыял «Варажбітка» (16+).**
22.10 **Серыял «Забойная сіла» (16+).**
0.00 «Міхаіл Жванецкі. «Вам дапамагчы ці не перашкаджаць?» (16+)
1.00 «Нашы навіны. Галоўнае за дзень».

### СТБ

5.30 «Тыдзень спорту».
6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 Навіны «24 гадзіны».
6.10, 20.15 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
9.10 «Мінск і мінчане».
9.40, 23.00 «Загадкі чалавецтва» (16+).
10.40, 20.30 **«Меч-2». Серыял (16+).**
12.20 «У апошні момант» (16+).
12.35, 23.45 «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
13.45, 0.25 «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
14.45 «Вадзіць па-руску» (16+).
15.15, 16.50 **«Лепш не бывае». Серыял (16+).**
19.55, 22.55 «СТБ-спорт».
20.05 «Сталічныя падрабязнасці».
22.05 «Глядзець усім!» (16+)
1.15 «Дзіўная справа» (16+).

### МІР

6.00, 10.10 **Серыял «Благая кроў» (16+).**
10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00 Навіны (бягучы радок).
13.15, 3.40 «Зала суда. Бітва за грошы» (16+).
14.10, 2.05 «Справы сямейныя. Бітва за будучыню» (16+).
15.05, 2.50 «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
16.15, 1.30 «Гульня ў кіно» (12+).
17.00 **Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).**
19.20, 4.25 **Серыял «Пляж» (16+).**
21.20 **Маст. фільм «Нерэальнае каханне» (12+).**
23.15, 0.10 **Маст. фільм «Ідэальная жонка» (16+).**

### РТР—Беларусь

7.00 «Раніца Расіі».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.25 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
12.35, 14.30, 20.40 **Серыял «Акушэрка. Новае жыццё» (12+).**
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
15.35 «60 хвілін». Ток-шоу.
17.25 «Лёс чалавека» (12+).
18.35 «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
22.30, 23.10 «Хто супраць?» Ток-шоу.
0.30 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

5.55 «Астрапрагноз».
6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
6.05 «За гранню» (16+).
6.25 Жанчыны і спорт.
7.10 «Цуд тэхнікі» (12+).
8.05 **Серыял «Мухтар. Новы след» (16+).**
9.40, 22.45 «НЗ.by».
10.20 **Серыял «Масква. Тры вакзалы» (16+).**
11.55 Пракурорская праверка (16+).
13.30 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
14.05, 16.30 **Серыял «Марскія д'яблы» (16+).**
17.05 «ДНК» (16+).
18.05, 20.00 **Серыял «Неўскі. Чужы сярод чужых» (16+).**
19.45 Сёння. Галоўнае.
23.10 **Серыял «Чужы твар» (16+).**

### 8 канал

7.00, 15.55, 18.55, 21.05, 0.40 «Надвор'е».
7.05 М/с.
7.25, 16.00 «Гумарынка».
7.30 **Камедыя «Прыстойныя людзі» (16+).**
9.05 Дак. серыял «Навучыце майго гадаванца» (0+).
9.30, 19.00 **Серыял «Кандзіс Рэнуар» (16+).**
10.30 «Кітайскі Новы год» (0+).
11.00 **Камедыя «Мужчыны ў вялікім горадзе» (18+).**
13.00, 20.00 **Серыял «Апраўданы» (16+).**
13.50 **Камедыя «Мэверык» (16+).**
16.05 «Мультпарад» (0+).
16.30 **Серыял «Пуаро Агаты Крысці» (12+).**
17.20 **Меладрама «Тры таполі на Плюшчысе» (12+).**
20.50 «Вечарніца» (0+).
21.10 **Камедыя «Голая праўда» (16+).**
22.45 **Дэтэктыў «Містэрыум. Цемра ў бутэльцы» (16+).**





### ВТБ

6.05 Скетч-шоу «Даеш моладзь» (16+).
6.35 Скетч-шоу «Адна за ўсіх» (16+).
7.10 М/ф «Чычылэнд» (0+).
7.35 М/ф «Тры каты» (0+).
8.00 М/ф «Маша і Мядзведзь» (0+).
8.40 «Дзякуй богу, ты прыйшоў!» (16+)
10.10 «Уральскія пельмені» (16+).
13.45 Камедыя «Голая праўда» (16+).
15.40 Баявік «Турыст» (12+).



17.40 Фэнтэзі «Трус Пітэр» (6+).
19.20 Прыгоды «Джуманджы: покліч джунгляў» (12+).
21.30 Фантастыка «Чалавек-павук: вяртанне дадому» (12+).
0.00 Камедыя «Тата-дасвідос» (18+).
2.00 Драма «Лютасць» (16+).
4.15 «Дурні і дарогі» (16+).
5.00 «Лаві момант» (16+).

### Культура

6.30 «Маўглі». «Лятучы карабель». М/ф.
8.30 «Вольны вецер». Маст. фільм (0+).
9.55 «Андрэй Міронаў. Брава, Артыст!» Кінаканцэрт.
10.20 Тэлескоп.
10.50 «Сэрцы чатырох». Маст. фільм (0+).
12.20, 1.45 «Дзікія Галапагосы». Дак. фільм.
13.10 Марыя Калас. Гала-канцэрт у Парыжскай оперы. 1958 год.
14.45 «Равесніцы». Маст. фільм (12+).
16.05 «Пешшу...» Масква жаночая.
16.35 «Прыгажосць па-руску». Дак. фільм.
17.30 «Рамантыка раманса». Песні пра каханне.
18.25 «Людзі і страсці Алісы Фрэйндліх». Дак. фільм.
19.10 «Жорсткі раманс». Маст. фільм (12+).
21.30 Чачылія Бартолі і Ільдар Абдразакаў у оперы Дж. Расіні «Італьянка ў Алжыры». 2018 год.
0.15 «Сэрцы чатырох». Маст. фільм (0+).
2.40 «Вецер уздоўж берага». «Востраў». М/ф для дарослых.

### Настальгія

6.00 «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. Трыа «Меридиан». 2008 год (12+).
6.55, 1.20 Маст. фільм «Шлях да сябе» (16+).
8.05, 9.45, 11.00, 14.40, 15.45, 17.00, 18.50, 20.35, 21.45, 23.00, 0.50, 2.40, 3.45, 5.00 Музычная настальгія (12+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 18.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
12.00 «Яловая субмарына». 2005 год (12+).
12.45 Канцэрт «Sixties Rock». 2004 год (12+).
13.30 Фільм-спектакль «Не заплачу!» 1983 год (12+).



17.25 Серыял «33 квадратныя метры. Дачныя гісторыі» (16+).
19.10 «Тэатральныя сустрэчы». 1980 год (12+).
22.00 «Колба часу» (16+).
0.00 «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Савецкі Саюз і класіка». 2007 год (16+).
5.15 Тэлефільм «А. П. Чэхаў. «Сцэнкі». 1973 год (12+).

### EuroSport 1

1.35, 4.00, 7.30, 10.30, 13.30, 17.00, 20.30 Біятлон. Чэмпіянат свету.
2.30 Аўтагонкі. Формула Е.
3.00, 11.30 Універсіяда.
5.00, 8.30, 22.30 Снукер. Players Championship.
7.00, 16.30 Watts.
12.15, 14.30, 19.45 Горныя лыжы. Кубак свету.
21.15 Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.

### Кінакамедыя

0.25 Ас з асаў (16+).
2.25 Аксамітныя ручкі (16+).
4.15 Кур'ер (16+).
6.05 Сем кабінак (18+).
8.00 Каханне не па памеры (16+).
9.50 Улюбёнцы Амерыкі (16+).
11.50 Адчыніце, паліцыя! (16+)
13.55 Сексаголік (16+).
15.40 Кароль вечарынак (16+).
17.30 Хлапечнік у Еўропе (18+).
19.30 Мужчыны супраць жанчын (16+).
21.40 Жанчыны супраць мужчын (16+).
23.35 Superнянь (16+).

### ТБ3

6.00 М/ф (6+).
8.45 «Улегцы» (12+).
9.15 Калекцыя «Беларусьфільма». Фільм — дзецям «Пра Чырвоную Шапачку. Працяг старой казкі» (6+).
11.40 «Тайны нашага кіно «Службовы раман» (12+).
12.15 «Службовы раман». Камедыя (6+).
15.05 «Сямейка Крудс». Анімацыйны фільм (0+).
16.45, 2.20 «Жонка напракат». Камедыя (12+).
20.30 «Жанчыны». Камедыя (16+).
22.30 «1 + 1». Драма (16+).
0.30 «Вокладка» (16+).
1.00 «Мужчына і жанчына. Адчуйце розніцу». Дак. фільм (16+).
5.30 «Лінія абароны» (16+).

### ТБ1000

6.10, 17.30 Малая на мільён (16+).
8.45 12 гадоў рабства (16+).
11.20 Затура: касмічная прыгода (12+).
13.20 Асцярожна, дзверы зачыняюцца! (16+)
15.20 Сфера (16+).
20.10 Кінг Конг (16+).
23.45 Птушачка на правадзе (16+).
2.00 Аляксандр (16+).
5.20 Бэтмен: пачатак (12+).

### ТБ1000 Рускае кіно

6.20 Адной левай (12+).
8.10 Іронія кахання (16+).
10.05 Ты ў мяне адна (16+).
12.10 Іван Царэвіч і Шэры Воўк (12+).
14.00 Шчасця! Здароўя! (16+)
15.50 Прыцягненне (12+).
18.10 Мамы (12+).



20.20 Я худзею (16+).
22.25 Бабуля лёгкіх паводзін (16+).
0.15 Каханне з абмежаваннямі (16+).



2.20 На кручку! (16+)
4.10 Стальны матылёк (16+).

### National Geographic

0.30 Другая сусветная вайна (16+).
1.15, 2.50, 4.20, 9.40 Расследаванні авіякатастроф (16+).
2.00 Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
3.35, 8.00, 18.10 Аўта-SOS (16+).
5.10 Інжынерныя ідэі (16+).
6.00 Гульні розуму (16+).
6.25 Панарама 360 (16+).
7.15 Скануючы час (16+).
10.30 Вялікі канал Кітая (16+).
11.15 Дзікі тунец (16+).
12.40 Сакрэтныя матэрыялы старажытнасці (16+).
13.30 «Джэйн» (16+).
15.00, 19.50, 23.05 Тайныя гісторыі (16+).
15.30, 20.40 Геній (16+).
16.20, 21.30 Дыяна: згубленыя кадры (16+).
19.00, 22.15 Суперзбудаванні старажытнасці (16+).
23.55 «Я — Малала» (16+).

### Discovery

8.00 Апошнія жыхары Аляскі.
9.00 Залатая ліхаманка.
10.00, 13.00, 16.30, 1.00, 4.40, 6.20, 7.35 Мужчынскія бярлогі.
17.00, 20.00, 23.00 Мужчыны, жанчыны, прырода.
0.00 Найлепшы збройнік.

## Беларусь 1

**6.10, 9.10, 12.10 Серыял «Вой, ма-мач-кі!.. 2» (12+).**
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
**14.05 Серыял «Сваты-6» (12+).**
**15.10, 21.45 Серыял «Кладоўка жыцця» (16+).**
21.00 «Панарама».
**23.25 Меладрама «Тры дні на каханне» (16+).**
1.20 «Дзень спорту».

## Беларусь 2

7.00 М/с «Машыны казкі» (0+).
**7.10 Камедыя «8 першых спатканняў» (16+).**
8.40, 21.55 «Тэлебарометр».
8.45 Анімацыйны фільм «Маана» (0+).
**10.20, 22.05 Меладрама «Каханне не па памеры» (16+).**
12.05 «Веру не веру» (16+).
13.05 «Блізняты» (16+).
**14.05 Камедыя «Жаніх напракат» (12+).**
16.00 «Тата папаў» (16+).
**17.45 Меладрама «Прывід» (12+).**
**19.50 Меладрама «Красуня» (12+).**
22.00 «Спортлато 5 з 36», КЕНО.
23.45 «Арол і рэшка. Кругасветка» (16+).

## Беларусь 3

7.00, 12.20, 20.15 Навіны культуры.
7.15, 20.30 «Гэты дзень».
7.20 М/ф (0+).
**8.05 «Марозка». Фільм-казка (6+).**
9.25 «Беларуская кухня». Курыца, запечаная ў цесце.
9.50 «Спявае Беларусь».
**10.45 «Вясна на Зарэчнай вуліцы». Меладрама (12+).**
**12.35 «Каханне з акцэнтам». Камедыя (12+).**
14.20 С. Пракоф'еў. «Рамэа і Джульета». Балет Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь.
**16.05 «Карнавал». Камедыя (12+).**
18.35 «Славянскі базар у Віцебску — 2018». Канцэрт «Залаты хіт».
20.40 «Калыханка» (0+).
**21.05 «Упершыню замужам». Меладрама (12+).**
22.40 «Славянскі базар у Віцебску — 2018». Канцэрт «Рытмы лета».

## Беларусь 5

7.00, 22.00 Тэніс. WTA. Індыян-Уэлс.
9.00 Біятлон. Чэмпіянат свету. Эстэрсунд. Змешаная эстафета.
10.20 Хакей. Чэмпіянат Беларусі. 1/4 фіналу. Другі матч.
12.15 Фактар сілы.
12.45 Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1/8 фіналу. «Айтрахт» — «Інтэр». Першы матч.
14.40 Свет англійскай прэм'ер-лігі. Відэачасопіс.
15.10 Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1/8 фіналу. «Валенсія» — «Краснадар». Першы матч.
17.05 Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1/8 фіналу. Першыя матчы. Агляд.
18.05 Біятлон. Чэмпіянат свету. Эстэрсунд. Спрынт. Жанчыны.
19.30 Хакей. КХЛ. 1/4 фіналу. Заходняя канферэнцыя. Шосты матч. (У перапынках — Спорт-цэнтр.)

## АНТ

7.00, 9.00, 16.00, 20.30 «Нашы навіны».
**7.10 Меладрама «Будзьце маім мужам» (12+).**
8.55 «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**9.10 Кіно ў колеры. Меладрама «Вясна на Зарэчнай вуліцы» (0+).**
**11.00 Камедыя «Каралева бензакалонкі» (0+).**



**12.30 Маст. фільм «Аляксандра» (16+).**
**14.15, 16.20 Меладрама «Забытая мелодыя для флейты» (12+).**
17.20 «Будзьце шчаслівыя заўсёды!» Вялікі святочны канцэрт (16+).
19.05 «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**19.10, 21.05 Меладрама «Масква слязам не верыць» (6+).**
**22.40 Камедыя «Я худзею» (12+).**

## СТБ

6.30 «Легенды СССР» (16+).
8.10 «Спецыяльны рэпартаж СТБ».
**8.30, 1.05 Камедыя «Самая абаяльная і прывабная» (12+).**



**10.00 «Як выйсці замуж за мільянера». Серыял (12+).**
13.30, 16.30, 19.30 Навіны «24 гадзіны».
**13.40, 16.40, 20.05 «Пад абцасам». Серыял (16+).**
19.55, 22.55 «СТБ-спорт».
**22.00 «Грамадзянка Кацярына». Серыял (12+).**

## МІР

**5.30 Маст. фільм «Добры дзень, я ваша цётка!» (6+)**
**7.10 Маст. фільм «Папялушка» (0+).**
**9.00, 10.10, 16.15, 19.15 Серыял «Бабін бунт, або Вайна ў Навасёлкаве» (16+).**
10.00, 16.00, 19.00 Навіны (бягучы радок).
**23.30 Маст. фільм «Дванаццаць крэслаў» (6+).**
